WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

14 КАСТРЫЧНІКА 2011 г. ПЯТНІЦА

№ 196 (27060)

Кошт 800 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## НАВУЧЭНЦАМ І СТУДЭНТАМ У БЕЛАРУСІ З 1 ЛІСТАПАДА БУДУЦЬ УСТАНОЎЛЕНЫ ШТОМЕСЯЧНЫЯ ДАПЛАТЫ Ў ПАМЕРЫ 65 ПРАЦЭНТАЎ АД СТЫПЕНДЫІ

**Адпаведны ўказ № 460 «Аб аказанні дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі навучэнцам» падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 13 кастрычніка.**

Указам прадугледжваецца ўстанаўленне штомесячных даплат да стыпендый, назначаных у адпаведнасці з заканадаўствам (акрамя стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь студэнтам і курсантам устаноў вышэйшай адукацыі).

Навучэнцам устаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі, навучэнцам і курсантам устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі, студэнтам і курсантам устаноў вышэйшай адукацыі, дзецям-сіротам, дзецям, якія засталіся без апекі бацькоў, а таксама асобам з іх ліку, якія асвойваюць змест адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі асоб да паступлення ва ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь, будзе ўстаноўлена штомесячная даплата ў памеры 65 працэнтаў ад стыпендыі. Для аспірантаў і дактарантаў штомесячная даплата будзе ўстаноўлена ў памеры 30 працэнтаў ад стыпендыі.

Пры гэтым названыя даплаты не будуць улічвацца пры вызначэнні сродкаў, якія накіроўваюцца на ўстанаўленне надбавак да стыпендый за поспехі ў вучобе, навуковай і грамадскай рабоце і аказанне матэрыяльнай дапамогі. Увядзенне даплат да стыпендый дасць магчымасць захаваць узровень даходаў асоб, якія атрымліваюць адукацыю, і забяспечыць іх сацыяльную абароненасць. Указ уступае ў сілу з 1 лістапада 2011 года.

## ТАВАРААБАРОТ У МЫТНЫМ САЮЗЕ ПА ВЫНІКАХ 2011 ГОДА МОЖА ДАСЯГНУЦЬ $110 МЛРД

**Аб гэтым было заяўлена 13 кастрычніка на сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з міністрам прамысловасці і гандлю Расіі, спецыяльным прадстаўніком Прэзідэнта Расіі па пытанні ўнясення змяненняў у дагавор аб Камісіі Мытнага саюза Віктарам Хрысценкам.**

Вітаючы Віктара Хрысценку, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што яго «прыезд якраз на злобу дня», паколькі «сёння вельмі актыўна абмяркоўваюцца палажэнні артыкула прэм'ер-міністра Расіі Уладзіміра Пуціна аб далейшай інтэграцыі на постсавецкай прасторы». Пры гэтым кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што ініцыятыва стварэння Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы (АЭП) першапачаткова належала менавіта Уладзіміру Пуціну. Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што таксама плануе апублікаваць артыкул, дзе выкладзе свае погляды на далейшую інтэграцыю. «Таму што я быў сведкам на ўсіх этапах, бачыў і ведаю, як гэта складвалася. Гэта будзе сумленна, калі аддаць належнае Пуціну ў фарміраванні гэтага працэсу. Менавіта ён даў тады адмашку гэтаму працэсу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Будучы кандыдат у Прэзідэнты, хутчэй за ўсё, Прэзідэнт Расіі будучы, калі ён першы абазначыў тэзісам якраз навядзенне парадку ў нашым былым агульным доме і выбудоўванне адносін з суседзямі — гэта, напэўна, ужо дарагога каштуе. Таму я лічу, што гэта адпавядае нашай беларускай пазіцыі. У размове з ім я аб гэтым сказаў», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

Віктар Хрысценка адзначыў, што Прэзідэнт Беларусі заўсёды быў актыўным і паслядоўным удзельнікам інтэграцыйных працэсаў, якія адбываюцца. «Добра і прынцыпова важна, што, нягледзячы на, магчыма, доўгі тэрмін, рух ідзе ў адным напрамку, які выбраны стратэгічна. Шчыра кажучы, перашкод для гэтага руху ўзнікала даволі шмат самых розных, знешніх у першую чаргу, і зразумела, што не ўсім, нават вельмі многім, магчыма, не вельмі падабаецца паглыбленне інтэграцыі на постсавецкай прасторы. І таму, напэўна, важны той этап, які цяпер перажывае ўвесь гэты працэс», — канстатаваў Віктар Хрысценка.

Па выніках сустрэчы Віктар Хрысценка адзначыў, што «яна ў нейкай ступені падвяла базіс або рысу пад поўным узаемаразуменнем паміж Расіяй і Беларуссю ў поглядах на гэты новы орган». «Нават не вельмі істотных рознагалоссяў на гэты момант няма», — сказаў ён.

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ КАЛЕКТЫЎ ГАЗЕТЫ «КУЛЬТУРА»

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў газеты «Культура» з 20-годдзем з дня выхаду ў свет яе першага нумара.**

«За гэты час выданне стала неад'емнай часткай духоўнай прасторы нашай краіны і заваявала папулярнасць у чытачоў, — гаворыцца ў віншаванні. — Сёння газета іграе прыкметную асветніцкую ролю, фарміруе грамадскую думку і аказвае станоўчы ўплыў на росквіт культуры і мастацтва ў Беларусі». Аляксандр Лукашэнка пажадаў калектыву газеты моцнага здароўя, шчасця, невычэрпных сіл і новых прафесійных дасягненняў.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ВУП БЕЛАРУСІ ЗА СТУДЗЕНЬ—ВЕРАСЕНЬ УЗРОС НА 7,9 ПРАЦЭНТА ДА BR186,7 ТРЛН

Аб гэтым паведаміла карэспандэнту **БЕЛТА** прэс-сакратар Нацыянальнага статыстычнага камітэта Алена Кандраценка. У адпаведнасці з прагнозам сацыяльна-эканамічнага развіцця ў 2011 годзе рост ВУП павінен скласці да ўзроўню 2010 года 109-110 працэнтаў. Вытворчасць прамысловай прадукцыі за студзень—верасень гэтага года ўзрасла на 10,6 працэнта і склала Br206,7 трлн (гадавы прагноз росту — на 9-9,5 працэнта).

Сёння — Дзень маці

# «ВАС, ЯК НІХТО, ЧАКАЕ МАМА»

**У сям'і Алены і Пятра Неваднічыкаў растуць тры сыны і чатыры дачкі**

**Усё ў гэтай вясковай сям'і як ва ўсіх: дом, гаспадарка, штодзённыя клопаты, толькі вось колькасцю дзяцей, як у іх, далёка не кожны пахваліцца і ў вёсцы. Старэйшая дачушка Алены Мікалаеўны вучыцца на другім курсе навучальнай установы, а малодшая сёлета пайшла ў першы клас.**

Алена смяецца: «У мяне 14 гадоў садаўскага стажу і будзе крыху больш за 20 школьнага». З таго часу, як старэйшая Святлана пайшла ў дзіцячы садок, увесь час дашкольную ўстанову хтосьці наведваў, аж пакуль Ніна не стала школьніцай — і так 14 гадоў. Ну і адпаведна лічыцца школьны стаж. Бо і ў дзіцячы сад, і ў школу дзяцей выправіць не азначае толькі іх накарміць, памыць, папрасаваць адзенне. Усе дзіцячыя цяжкасці, праблемы, няўпэўненасць і страхі, альбо наадварот, ляноту ці нежаданне прыкласці пэўныя намаганні да прадмета, а таксама радасць ад першых поспехаў трэба з дзецьмі прайсці, адпакутаваць і адсвяткаваць. Матулі разумеюць, пра што я гавару. Алена ўсё гэта праходзіць сёмы раз. Цяпер, праўда, крыху лягчэй, бо з урокамі малодшым заўсёды дапамогуць старэйшыя. Зараз у сям'і пяць школьнікаў: Наталля вучыцца ў восьмым класе, Таня — у шостым, Коля ў пятым, Дзіма — у трэцім, Ніна — у першым. Старэйшыя дачка і сын атрымліваюць спецыяльнасці ў Брэсце і Высокім.

СТАР. 3



Фота Святланы ЯСКЕВІЧ.

## СТАЎКА РЭФІНАНСАВАННЯ ПАВЫШАЕЦЦА ДА 35 ПРАЦЭНТАЎ

**Стаўка рэфінансавання Нацыянальнага банка Беларусі з 14 кастрычніка павышаецца да 35 працэнтаў гадавых, паведамілі БЕЛТА ва ўпраўленні інфармацыі Нацбанка.**

Адпаведная пастанова ад 12 кастрычніка № 442 прынята праўленнем Нацыянальнага банка. Гэта рашэнне з'яўляецца чарговым крокам у паслядоўнай рэалізацыі агульнаэканамічнай палітыкі Нацыянальнага банка і ўрада, накіраванай на макраэканамічную стабілізацыю, змяншэнне націску на абменны курс беларускага рубля і зніжэнне ўзроўню інфляцыі. Нацыянальны банк сумесна з урадам прадоўжаць прыняцце стабілізацыйных мер з улікам развіцця знешніх і ўнутраных эканамічных працэсаў, адзначылі ва ўпраўленні. Апошні раз стаўка рэфінансавання павышалася 14 верасня 2011 года на 3 працэнтныя пункты да 30 працэнтаў гадавых.

## КУРС ПАКУЛЬ РАСЦЕ

Пасля чарговай дадатковай сесіі на Беларускай валютна-фондавай біржы долар падаражэў на 300 рублёў, еўра — на 600, а расійскі рубель — на 25. Пасля таргоў 12 кастрычніка долар каштаваў 8710 рублёў, еўра — 12010, расійскі рубель — 276.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

**Рынкавыя курсы на 13 кастрычніка:**

Долар ЗША — 9010 беларускіх рублёў;
Еўра — 12610 беларускіх рублёў;
Расійскі рубель — 301 беларускі рубель.

**Курсы некаторых банкаў на 13 кастрычніка.**

**«Беларусбанк»:** долар ЗША — 9050 і 9600; еўра — 12550 і 13150; расійскі рубель — 292 і 305.

**«Дэльта Банк»:** долар ЗША — 8800 і 9700; еўра — 11900 і 13000; расійскі рубель — 260 і 305.

**«Беларускі народны банк»:** долар ЗША — 9000 і 9500; еўра — 12350 і 13210; расійскі рубель — 290 і 310.

## ЗАРАБІЎ НА ЗДЗЕЛКАХ З АЎТО МІЛЬЯРД

**Наваполацкім міжраённым аддзелам Упраўлення дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю па Віцебскай вобласці заведзена крымінальная справа ў адносінах да жыхара Наваполацка, які незаконна гандляваў патрыманымі аўтамабілямі.**

Высветлілася, што гэты грамадзянін, не з'яўляючыся афіцыйна зарэгістраваным індывідуальным прадпрымальнікам, сёлета на працягу дзевяці месяцаў незаконна ажыццяўляў дзейнасць па куплі-продажы трыццаці патрыманых аўтамабіляў на тэрыторыі нашай краіны. Пры гэтым ён атрымаў даход у асабліва буйным памеры — 1 мільярд рублёў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ЧАЛАВЕК ЗАГІНУЎ, «БМВ» УСМЯТКУ

**Жыхар Магілёва, якому толькі 24 гады, даездзіўся насуперак правілам і законам.**



Фота Магілёўскай ДАІ.

Гэтага маладога мужчыну ДАІ лічыць злосным парушальнікам. Яго ўжо некалькі разоў затрымлівалі за рулём нецвярозым і пазбаўлялі права на кіраванне аўтатранспартам. Сёлета суд вырашыў, што яму забаронена кіраваць аўтамабілямі 5 гадоў, а штраф склаў 250 базавых велічынь.

Аднак 11 кастрычніка мужчына сеў за руль «БМВ», і гэта дрэнна скончылася. Уначы паблізу вёскі Мазалава Мсціслаўскага раёна ён, прапусціўшы паварот і імкнучыся выправіць сітуацыю, на высокай хуткасці рэзка крутануў руль — і аўтамабіль некалькі разоў перакуліўся. Працэс спыніла толькі прыдарожнае дрэва: кола адляцела на сорак метраў, радыятар знайшлі на дрэве.

— Для 25-гадовага пасажыра гэтая паездка аказалася апошняй: ён памёр па дарозе ў бальніцу, — расказала **інспектар аддзялення агітацыі і прапаганды ДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама Вольга ВЯРШУБСКАЯ.** — Другі пасажыр шпіталізаваны.

**Ілона ІВАНОВА.**

## «РАЗВОД» ДЛЯ БЛАНДЗІНАК

**На нумар электроннага кашалька, зарэгістраванага на імя «Гардон Вольга» на сайце www.intel-telecom.com дзве маладыя жыхаркі Мазырскага раёна ў пачатку верасня адправілі па 2 млн 200 тысяч рублёў.**

Дзяўчыны зрабілі гэта пасля таго, як атрымалі SMS-паведамленні аб тым, што быццам выйгралі аўтамабіль «Аўдзі-А6». Ім было прапанавана для атрымання прыза перавесці 1 працэнт ад кошту выйгрышу на ўказаны адрас. Пасля доўгага чакання грамадзянкі зразумелі, што сталі ахвярамі ашуканцаў і звярнуліся ў міліцыю.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## СЕТКІ НА 1,5 КІЛАМЕТРА І 2 ТЫСЯЧЫ РЫБІН

Паблізу возера Чорнае ў Бярозаўскім раёне дзяржінспектары затрымалі машыніста Бярозаўскай ГРЭС, які разам з неўстаноўленай асобай браканьерыў — лавіў рыбу сеткамі. Апошніх у затрыманага канфіскавана 22, агульнай даўжынёй больш за 1,4 кіламетра. А таксама ўлоў — 2 040 асобін розных відаў рыб агульнай вагой 120 кілаграмаў. Здабыча была здадзеная на сартавальную базу рыбгаса «Сялец». Што да самога парушальніка, дык ён, пагрузіўшы ёмістасці з незаконна здабытай рыбай і сеткамі ў легкавы аўтамабіль «Масквіч», таксама спрабаваў уцячы. Аднак пасля непрацяглага пераследу дзяржінспектарамі быў затрыманы ў вёсцы Хрыса. Сваімі дзеяннямі браканьер нанёс прыродным рэсурсам шкоду ў асабліва буйным памеры — на суму больш за 9,6 мільёна рублёў (275 базавых велічынь).

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## КРЫЎДЗІЦЕЛІ БЕЛАРУСАЎ ТРАПІЛІ НА ПАРТУГАЛЬЦАЎ

Учора ў польскім Кракаве адбылася жэраб'ёўка стыкавых гульняў каманд, якія занялі другія месцы ў сваіх групах у адборачным турніры да чэмпіянату Еўропы па футболе-2012, які пройдзе ў Польшчы і Украіне. Атрымаліся наступныя пары: Турцыя — Харватыя, Эстонія — Ірландыя, Чэхія — Чарнагорыя, Партугалія — Боснія і Герцагавіна. Гульні адбудуцца 11—12 і 15 лістапада (першымі ўказаныя гаспадары ў стартавых матчах).

**Ул. інф.**

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*


## ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

Республика Беларусь, 220007, г. Минск, ул. Московская, 14

**Центр клиентской поддержки ЗАО Банк ВТБ (Беларусь): (017) 309 15 15, (029) 309 15 15, (033) 309 15 15. www.vtb-bank.by**

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2011 г.

ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2011 г. | 2010 г. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 135 379,6 | 37 502,7 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 1 049 015,8 | 216 991,2 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 810 242,3 | 246 901,5 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 129 086,7 | 172 047,9 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 2 577 071,3 | 1 293 557,7 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 192 918,1 | 3 117,1 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 471,6 | 470,8 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 96 981,3 | 69 745,6 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 7 693,6 | 6 924,7 |
| 12 | Прочие активы | 1111 | 34 322,2 | 21 306,9 |
| 13 | ИТОГО активы | 11 | 5 033 182,5 | 2 068 566,1 |
| 14 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | 491 614,6 | - |
| 16 | Средства банков | 1202 | 2 726 031,5 | 624 617,5 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | 1 463 801,7 | 954 538,4 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 32 063,4 | 241 023,8 |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | 0,3 |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | 33 221,1 | 10 393,5 |
| 21 | ВСЕГО обязательства | 120 | 4 746 732,3 | 1 830 573,5 |
| 22 | КАПИТАЛ | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | 84 370,2 | 84 370,2 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | 34 320,3 | 34 320,3 |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | 16 891,6 | 16 891,6 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 22 512,5 | 14 245,6 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | 128 355,6 | 88 164,9 |
| 28 | ВСЕГО капитал | 121 | 286 450,2 | 237 992,6 |
| 29 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 5 033 182,5 | 2 068 566,1 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 октября 2011 г.

ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2011 г. | 2010 г. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 229 396,7 | 138 757,3 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 131 365,0 | 76 034,8 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 98 031,7 | 62 722,5 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 75 435,4 | 32 090,3 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 18 933,9 | 7 938,1 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 56 501,5 | 24 152,2 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 5,0 | (1 295,8) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | (192 713,0) | 10 831,1 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 233 618,0 | 4 044,9 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 58 196,8 | 21 388,4 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 11 182,8 | 6 397,8 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 70 367,4 | 50 746,9 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 7 020,6 | 4 887,6 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 71 041,2 | 29 829,8 |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | 14 499,9 | 4 490,4 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 56 541,3 | 25 339,4 |

**Председатель Правления** **В.В. Иванов**
**Главный бухгалтер** **М.В. Дудко**
**Дата подписания «10» октября 2011 г.**

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 23 от 17.05.2010 г. УНП 101165625.


## КУРС — НА МАКСІМАЛЬНУЮ ДАСТУПНАСЦЬ ЛЕКАЎ, ЯК ПА АСАРТЫМЕНЦЕ, ТАК І ПА ЦАНЕ

**«Ні істотнае падаражанне лекаў, ні лекавы дэфіцыт беларусам не пагражаюць», — аб гэтым з упэўненасцю заявіла на сустрэчы з журналістамі начальнік упраўлення фармацэўтычнай інспекцыі і арганізацыі лекавага забеспячэння Міністэрства аховы здароўя Людміла РЭУЦКАЯ.**

Сапраўдны пярэпалах ва ўдзельнікаў фармацэўтычнага рынку выклікала рэкамендацыя Нацбанка прыпыніць продаж замежнай валюты на асноўнай гандлёвай сесіі Беларускай валютна-фондавай біржы па артыкуле «для аплаты лекавых сродкаў, вырабаў медыцынскага прызначэння (пры ўмове ўзгаднення іх пакупкі з Міністэрствам аховы здароўя). Фактычна імпарцёрам лекаў прапанавалі набываць валюту для закупкі замежнай фармацэўтычнай прадукцыі не па курсе Нацбанка, а намнога даражэй (на дадатковай сесіі), што абавязкова адбілася б на канчатковай цане ўвезеных у Беларусь лекавых прэпаратаў. Пры гэтым, згодна з Указам Прэзідэнта № 366 ад 11 жніўня 2005 года «Аб фарміраванні цэн на лекавыя сродкі, вырабы медыцынскага прызначэння і медыцынскую тэхніку», адпускная цана на імпартныя лекі павінна вызначацца, зыходзячы з курсу Нацбанка. Пры такім раскладзе, калі сітуацыя не будзе ўрэгуляваная, спецыялісты прадракалі беларускаму фармацэўтычнаму рынку поўны параліч, а пацыентам — пустыя паліцы ў аптэках.

— Як стала вядома Міністэрству аховы здароўя, банкамі краіны на тры дні была прыпынена канвертацыя валюты па курсе Нацбанка на закупку лекавых сродкаў. Міністэрства аховы здароўя падключылася да рашэння гэтай праблемы, і з 13 кастрычніка банкі зноў прыступілі да канвертацыі валюты па курсе Нацбанка, — запэўніла журналістаў Людміла Рэуцкая.

Па словах спецыяліста, Міністэрствам аховы здароўя ажыццяўляецца штотыднёвы маніторынг наяўнасці ў аптэках лекавых сродкаў. Напрыклад, напярэдадні сезона прастудных захворванняў на асаблівым кантролі знаходзіцца асартымент супрацьпрастудных і супрацьвірусных сродкаў.

— Мушу канстатаваць, што ніякіх трывожных тэндэнцый у забеспячэнні аптэк намі заўважана не было, — дадала спецыяліст. — Падстаў для рэзкага росту цэн таксама няма. Мяркую, што мы можам з аптымізмам глядзець у будучыню.

Людміла Рэуцкая высока ацаніла эфектыўнасць сумеснай працы вытворцаў і прадаўцоў фармацэўтычнай прадукцыі па стрымліванні цэн на ўнутраным рынку. Нагадаем, што айчынным і замежным вытворцам, а таксама афіцыйным дыстрыб'ютарам, якія ажыццяўляюць сваю дзейнасць на фармацэўтычным рынку Беларусі, было прапанавана далучыцца да Мемарандума па стрымліванні цэн тэрмінам да 31 снежня 2011 года ў новай рэдакцыі з улікам новых эканамічных рэалій. Па словах Людмілы Рэуцкай, да мемарандуму далучыліся амаль усе беларускія вытворцы, а таксама вялікая колькасць замежных кампаній-вытворцаў і пастаўшчыкоў. Да таго ж Міністэрствам аховы здароўя было ініцыяванае заключэнне Пагаднення па стрымліванні рознічных цэн на лекавыя сродкі ў аптэчных сетках. Згодна з гэтым Пагадненнем, аптэчныя сеткі ўзялі на сябе абавязацельствы стрымліваць рост цэн на лекавыя сродкі шляхам прымянення аптымальных гандлёвых надбавак, ажыццяўляць аптовую рэалізацыю лекавых сродкаў, атрыманых з фінансавымі зніжкамі, з мінімальнымі гандлёвымі надбаўкамі, інфармаваць Міністэрства аховы здароўя аб выпадках рэзкага росту адпускных цэн на лекавыя сродкі, максімальна выкарыстоўваць магчымасці аптэк усіх формаў уласнасці для прасоўвання лекавых сродкаў айчыннай вытворчасці і, у мэтах аптымізацыі імпарту, максімальна скарачаць закупкі замежных аналагаў айчынных лекавых сродкаў.

Людміла Рэуцкая паведаміла, што зараз рыхтуюцца змяненні ва Указ Прэзідэнта № 366, якія дазволяць праводзіць пераацэнку лекаў па меры неабходнасці. Пакуль што пераацэнка лекавых сродкаў дазваляецца пры змяненні курсу валют і наяўнасці крэдыторскай запазычанасці толькі першага чысла наступнага месяца. Таму некаторыя дыстрыб'ютары чакаюць наступлення новага месяца, каб паставіць чарговую партыю ўжо па новай цане. Унясенне змяненняў ва ўказ дазволіць пазбегнуць магчымых перабояў у пастаўках лекаў...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ЦЯСЛЯР ЗАГІНУЎ НА БУДОЎЛІ ФЕРМЫ

**У 8.30 у вёсцы Сасноўка Смаргонскага раёна на будоўлі малочна-таварнай фермы загінуў цясляр, мужчына 1989 года нараджэння.**

Пасля падачы пачкі шыферу (43 лісты) будаўнічым кранам на дах малочна-таварнай фермы, якая будавалася, адбылося разбурэнне бруса, на якім трымаўся дах. У выніку цясляр упаў разам з грузам, атрымаўшы цялесныя пашкоджанні.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


## ЗАО «ДЕЛЬТА БАНК»

*220036, г. Минск, ул. Розы Люксембург, 95.*
*Тел. 256 19 08, www.deltabank.by*

ДЕЛЬТА БАНК

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2011 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2011 | 01.10.2010 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 88 051,4 | 10 615,7 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 63 664,5 | 20 048,8 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 115 866,9 | 58 475,0 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 36 827,1 | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 386 942,7 | 133 333,2 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 30 383,8 | 329,6 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 1 020,5 | 703,4 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 12 117,2 | 9 173,9 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | - | - |
| 12 | Прочие активы | 1111 | 12 218,9 | 7 077,4 |
| 13 | ИТОГО активы | 11 | 747 093,0 | 239 757,0 |
| 14 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 15 | Средства Национального банка | 1201 | 31 547,1 | 15 059,1 |
| 16 | Средства банков | 1202 | 129 058,0 | 9 847,6 |
| 17 | Средства клиентов | 1203 | 442 076,2 | 139 884,0 |
| 18 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 12 289,2 | 684,6 |
| 19 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 4 510,8 | 761,8 |
| 20 | Прочие обязательства | 1206 | 13 705,1 | 1 168,5 |
| 21 | ВСЕГО обязательства | 120 | 633 186,4 | 167 405,6 |
| 22 | КАПИТАЛ | | | |
| 23 | Уставный фонд | 1211 | 72 200,0 | 72 200,0 |
| 24 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 25 | Резервный фонд | 1213 | 3 610,0 | 739,6 |
| 26 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 2 001,7 | 376,8 |
| 27 | Накопленная прибыль | 1215 | 36 094,9 | (965,0) |
| 28 | ВСЕГО капитал | 121 | 113 906,6 | 72 351,4 |
| 29 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 747 093,0 | 239 757,0 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 октября 2011 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2011 | 01.10.2010 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 24 643,0 | 11 698,8 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 36 888,1 | 12 130,6 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | (12 245,1) | (431,8) |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 69 282,0 | 27 320,7 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 4 392,0 | 1 572,3 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 64 890,0 | 25 748,4 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 171,5 | (2 428,7) |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 29 118,9 | (947,5) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 4 292,0 | 2 680,2 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 7 982,6 | 5 125,1 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 36 407,4 | 23 786,3 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 2 952,4 | 1 564,0 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 46 266,1 | (965,0) |
| 16 | Налог на прибыль | 212 | 10 349,2 | - |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 35 916,9 | (965,0) |

**Председатель Правления** **А.Г. Столяров**
**Главный бухгалтер** **Е.М. Грибанова**
**Дата подписания «04» октября 2011 г.**

Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 27 от 01.09.2007 г. УНП 807000015.


ISSN 1990 - 763X

**Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.10.2011 г. (для б/н разлікаў)**

| | | | |
|---|---|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША | 5 731,00 | 1 чэшская крона | 318,11 |
| ▲ 1 еўра | 7 914,51 | 1 польскі злоты | 1 823,97 |
| 1 латвійскі лат | 11 161,75 | ▲ 1 расійскі рубель | 183,68 |
| 1 літоўскі літ | 2 281,31 | 1 украінская грыўня | 716,02 |

**Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 31,2014 |
| 10 UAH | 38,9045 |
| 10000 BYR | 54,1221 |
| EUR | 43,0236 |

# КАРПАРАТЫЎНАЯ ПРЭСА ПАВІННА АРЫЕНТАВАЦЬ НА СТАБІЛЬНАЕ РАЗВІЦЦЁ ДЗЯРЖАВЫ І ГРАМАДСТВА

**ПРА гэта заявіў намеснік міністра інфармацыі Уладзімір Матусевіч у Мінскай гарадской ратушы на семінары для галоўных рэдактараў шматтыражных газет Мінска «Сродкі масавай інфармацыі прадпрыемстваў і вышэйшых навучальных устаноў і іх роля ў сістэме ідэалагічнай работы». Такі семінар арганізаваны ўпершыню ў Беларусі.**

Уладзімір Матусевіч адзначыў, што задачы карпаратыўнай прэсы пераклікаюцца з задачамі ідэалагічнымі. Асноўныя з іх — фарміраванне грамадскай думкі, пазітыўнай атмасферы ў калектыве, пачуцця гонару за сваё прадпрыемства, ВНУ і ў выніку ў цэлым за краіну. «Задачы тут падобныя — аб'ядноўваць калектыў, праз пазітыўную атмасферу фарміраваць пазітыўнае ўспрыманне навакольнай рэчаіснасці, якая забяспечвае стабільнасць сацыяльных настрояў, а значыць, стабільнае развіццё дзяржавы і грамадства», — сказаў намеснік міністра.

Намеснік міністра інфармацыі канстатаваў, што шматтыражныя выданні краіны пакуль адрозніваюцца па сваім якасным і змястоўным узроўні. «Ёсць, на жаль, выданні, якія недалёка адышлі ад баявых лісткоў (у горшым разуменні гэтага слова) узроўню 70-х гадоў мінулага стагоддзя», — сказаў ён. У той жа час многія ўяўляюць выданні высокага ўзроўню, перш за ўсё па змесце. Пра іх запатрабаванасць сведчаць тыражы, якія дасягаюць 11 тыс. экзэмпляраў. «Калі чытаеш, адчуваеш атмасферу, у якой жывуць прадпрыемствы. Гэта важнае дасягненне нашай карпаратыўнай прэсы», — адзначыў Уладзімір Матусевіч.

Гаворачы пра развіццё студэнцкіх газет, перспектыўным кірункам ён назваў асваенне новых тэхналогій і пераход у электронны фармат. «Гэта пашырыць аўдыторыю пры ўмове адаптацыі кантэнту СМІ да сучасных электронных носьбітаў — мабільных тэлефонаў, планшэтаў, рыдараў», — дадаў Уладзімір Матусевіч.

**Кар. БЕЛТА.**

# ЯК ПАВЫСІЦЬ ЯКАСЦЬ ПРАВАСУДДЗЯ

**Стан правапарадку і законнасці ў краіне ў значнай ступені звязаны з эфектыўнасцю дзейнасці судоў агульнай юрысдыкцыі. Менавіта на іх прыпадае 90% усіх судовых спраў, тут працуе асноўная колькасць суддзяў. Днямі, 10 кастрычніка, выйшаў Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 454 «Аб мерах па ўдасканаленні дзейнасці агульных судоў Рэспублікі Беларусь».**

*— Гаворка ідзе не пра ломку судаводства, а пра змену часткі судовых працэдур і арганізацыі правасуддзя,* — заявіў журналістам на прэс-канферэнцыі **Старшыня Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь Валянцін СУКАЛА.** — *У прыватнасці, плануецца ўзмацненнеаднаўленчых, прыміральных працэдур і скарачэнне карных і рэпрэсіўных функцый правасуддзя, што звязана з гуманізацыяй нашага крымінальнага і адміністрацыйнага заканадаўства.*

Асноўная задача, пазначаная ва Указе, — павысіць якасць правасуддзя і адначасова максімальна спрасціць і скараціць час самога судовага працэсу, зрабіць усё магчымае, каб крымінальныя справы, заведзеныя за нязначныя злачынствы, якія не ўяўляюць грамадскай небяспекі, канчаткова вырашаліся і спыняліся яшчэ на дасудовай стадыі. Ужо сёння гэта актыўна выкарыстоўваецца. Толькі за першае паўгоддзе гэтага года, па словах Валянціна Сукалы, было спынена больш за 5 тыс. нязначных крымінальных спраў да вынасу іх на судовае пасяджэнне. Мяркуецца, што некаторыя саставы эканамічных злачынстваў будуць выключаны з Крымінальнага кодэкса. Пашыраюцца магчымасці вынясення абвінавачага прысуду без прызначэння крымінальнага пакарання ў выпадку сацыяльнай кампенсацыі. Разглядаецца і магчымасць вынясення альтэрнатыўнага прысуду. Яго сутнасць заключаецца ў тым, што за некаторыя, прадугледжаныя законам, варыянты злачынстваў суд можа прызначаць як пазбаўленне волі, так і грашовы штраф досыць сур'ёзнага памеру (да 3 тыс. базавых велічынь) з вызначэннем тэрміну яго выплаты. У выпадку, калі штраф выплачваецца, пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі не прымяняецца.

Суддзі сёння перагружаны, але гэта не толькі беларуская, гэта сусветная праблема. Між тым павелічэння колькасці суддзяў у краіне не плануецца. Як лічыць Валянцін Сукала, яно цяпер аптымальнае з пункту гледжання арганізацыі судовай сістэмы (па міжнародных стандартах, 1 суддзя павінен прыпадаць на 6-7 тыс. насельніцтва; у нашай краіне сёння 1 суддзя на 8 тыс. насельніцтва).

*Пратакол судовых пасяджэнняў у тым выглядзе, у якім ён існуе сёння, састарэў і не адпавядае патрабаванням часу. Любы сакратар судовага пасяджэння фіксуе на паперы толькі 60% таго, што адбываецца ў зале судовага пасяджэння. Гэта выклікае мноства заўваг і нараканняў з боку ўдзельнікаў судовага працэсу. Затое поўны аўдыя- і відэазапіс пасяджэнняў выключыць усе пытанні. З другога боку, гэта будзе дысцыплінаваць удзельнікаў судовага працэсу і саміх суддзяў,* — паведаміў Валянцін Сукала.

Колькасць суддзяў, паводле яго слоў, можа быць нязначна павялічана толькі ў выніку стварэння новых спецыялізаваных судоў. У прыватнасці, гэта будуць суддзі, звязаныя з ювенальнай юстыцыяй, адміністрацыйным правасуддзем, падатковымі і зямельнымі справамі, справамі па абароне інтэлектуальнай уласнасці.

*— Нас не вельмі задавальняе інстытут народных засядацеляў у тым выглядзе, у якім ён існуе. Там ёсць фармальныя моманты, ён не выклікае належнага даверу ў людзей. І я не выключаю, што дзейны інстытут народных засядацеляў будзе паступова трансфармавацца ў суд прысяжных,* — заявіў Валянцін Сукала.

Дарэчы, у тых краінах, дзе існуе суд прысяжных, пад яго падпадае вельмі невялікая колькасць спраў — ад 2 да 5%. Асноўная частка правасуддзя ажыццяўляецца аднаасобна прафесійным суддзёй. Мяркуецца, калі ў нашай краіне будзе ўведзены гэты інстытут, ён таксама будзе выкарыстоўвацца ў вельмі абмежаванай колькасці крымінальных спраў, як правіла, звязаных з найбольш цяжкімі і небяспечнымі злачынствамі.

Надзённым сёння з'яўляецца і прымусовае выкананне судовых рашэнняў. Многія грамадзяне лічаць неабавязковым пры атрыманні выканаўчага ліста зрабіць усё ва ўказаны тэрмін, спрабуюць пазбегнуць выканання рашэння суда. *Таму сёння будзе разглядацца пытанне аб вызначэнні не толькі адміністрацыйнай адказнасці за невыкананне судовых рашэнняў і непавагу да суда, але я не выключаю і ўвядзенне крымінальнай адказнасці за грубае невыкананне судовых рашэнняў,* — заявіў журналістам старшыня Вярхоўнага Суда. Не выключае ён і ўвядзенне інстытута судовых прыставаў, як у РФ.

Санкцыі Еўрасаюза ў адносінах да беларускіх суддзяў з'яўляюцца недапушчальнымі, заявіў Валянцін Сукала, каментуючы ўвядзенне візавых абмежаванняў ЕС у адносінах да беларускіх суддзяў і пракурораў. Ён падкрэсліў, што цяпер існуюць агульныя міжнародныя дакументы аб незалежнасці суддзяў, і ўсе яны забараняюць увядзенне якіх-небудзь санкцый у адносінах да суддзяў. «Такія меры мы разглядаем як шантаж і ўмяшанне ў судовую сістэму Беларусі. Мы лічым гэта недапушчальным», — сказаў старшыня Вярхоўнага Суда.

**Святлана БУСЬКО.**

Марэк СІКОРА:

# «У СЯРЭДЗІНЕ МАТЧА ГУЛЯЕМ БЕЗ ГАЛАВЫ»

**Сталічнае «Дынама» ўдала завяршыла пяціматчавую хатнюю серыю паядынкам супраць казахскага «Барыса» — 5:2. Мінскі клуб займае другое месца ў Заходняй канферэнцыі, набраўшы 24 ачкі ў 13 матчах. На матчы супраць «Барыса» ў гэтым сезоне ўпершыню быў аншлаг — 15 046 гледачоў.**

Ужо на 6-й хвіліне дынамаўцы павялі пасля шайбы Даніэля Корса, а на 8-й госці лік зраўнялі. Праз хвіліну «Дынама» зноў было наперадзе (вызначыўся Джэф Плат), а да канца перыяду вяло 3:1. Трэці перыяд цалкам застаўся за намі: шайбы закінулі Даніэль Корса і Збынек Іргл — 5:2.

Вось як пракаментаваў матч Марэк Сікора:

*— Практычна ў кожным матчы гуляем па адным сцэнары: добры першы перыяд, дрэнны другі, а ў трэцім зноў збіраемся. Не ведаю, з чым звязана, што ў сярэдзіне паядынку гуляем без галавы: нападаючыя думаюць толькі пра тое, каб забіць. Сёння ў другім перыядзе мы атрымалі 15-20 кантратак ад суперніка, але нас вельмі выручыў Кевін.*

Наступны паядынак «Дынама» правядзе на выездзе — гасцявая серыя пачнецца ў Казані супраць «Ак Барса» 16 кастрычніка.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ЖКГ: ПЫТАЕМСЯ Ў СПЕЦЫЯЛІСТА

## *Дыферэнцыяваная аплата за ваду: падрабязнасці*

**У нашай кватэры зарэгістраваныя 2 чалавекі. Дзеці нядаўна пабудавалі сабе жыллё, але пакуль не пераехалі і жывуць з намі. Так што ўсяго нас пражывае 5 чалавек. Між тым, нормы вады будуць разлічвацца на дваіх, а за перарасход прыйдзецца плаціць па большым тарыфе. Ці маем мы права звярнуцца ў ЖЭС з заявай, у якой просім улічваць усіх, хто рэальна пражывае ў кватэры? Ці можна тут паступіць як з медыцынскім абслугоўваннем, калі ідзеш да галоўнага ўрача паліклінікі, пішаш заяву і атрымліваеш медабслугоўванне па месцы жыхарства, а не там, дзе зарэгістраваны?..**

**МУРАШКА К.Г.**

**Адказвае начальнік Упраўлення эканомікі Міністэрства ЖКГ Алена ДУДЗІНСКАЯ:**

Цана на ваду на самой справе не такая ўжо і высокая. Падумайце самі — 2546 рублёў за 1 кубаметр, г.зн. за тону вады і тону каналізацыі. Гэта 667 бутэлек па паўтара літра. Зараз 1,5-літровая бутэлька простай пітной вады каштуе недзе 2 тысячы рублёў. Колькі будуць каштаваць 667 бутэлек (або тона) вады ў магазіне? 1млн 334 тыс. рублёў. А тут тона вады ўсяго за 2546 рублёў. Гэтыя тарыфы толькі называюцца эканамічна абгрунтаванымі, на самой справе яны адсталі ад рэальнага кошту, не заўсёды ёсць магчымасць іх перагледзець.

Я думаю, цяпер шмат сітуацый, калі ў кватэры шмат зарэгістраваных, але мала пражывае на самой справе, і наадварот. Падстаў для пераразліку ў такіх выпадках няма. Такія падставы ёсць толькі ў пэўных сітуацыях, калі чалавек нейкі час адсутнічаў у кватэры. Але наўрад ці хтосьці прыйдзе ў гэтым выпадку з заявай (хіба толькі тады, калі ў кватэры няма прыбораў уліку вады), усе будуць карыстацца вадой па танных тарыфах.

Што тычыцца выпадку, калі кватэра здаецца і ёсць дамова найму прыватнага жылфонду, але ў кватэры наймальнік не зарэгістраваны, — гэтае пытанне зараз абмяркоўваецца ў міністэрстве, і ў самы бліжэйшы час у разліковыя цэнтры будуць накіраваныя тлумачэнні.

На дадзены момант таксама прапісваюцца правілы разліку за ваду ў сітуацыі, калі ў кватэры ніхто не зарэгістраваны або адсутнічае сістэма рэцыркуляцыі, а таксама для тых катэгорый жыльцоў, хто мае льготы па аплаце жылля.

## *У якіх выпадках робіцца пераразлік платы за камунальныя паслугі?*

**Збіраюся з'ехаць на два месяцы з кватэры. На ваду ў мяне ўстаноўленыя лічыльнікі, а вось на газ — не. Ці магу я разлічваць на пераразлік платы за газ па вяртанні? Ад платы за якія яшчэ паслугі я магу быць вызвалены на перыяд сваёй адсутнасці?**

**ПРЫХОЖЫН А.В.**

Як нам паведамілі ва Упраўленні эканомікі Міністэрства ЖКГ, плата за некаторыя віды камунальных паслуг (вываз і абясшкоджванне цвёрдых бытавых адходаў, халоднае і гарачае водазабеспячэнне, каналізацыя, газ) пры адсутнасці ў спажыўцоў прыбораў індывідуальнага ўліку расходу вады і газу не спаганяецца, калі грамадзянін выехаў з кватэры на тэрмін звыш 10 сутак запар.

Пры гэтым ён павінен прадаставіць дакументальна пацверджаныя падставы, па якіх давялося выехаць:

✓ Пры выездзе за мяжу прадастаўляецца дакумент, які пацвярджае знаходжанне за мяжой (імянныя праязныя дакументы і (або) пашпарт з адзнакамі аб перасячэнні мяжы або рэгістрацыі па месцы жыхарства за мяжой, від на жыхарства або іншыя дакументы, якія пацвярджаюць знаходжанне за мяжой, на дзяржаўнай мове Рэспублікі Беларусь, завераныя належным чынам);

✓ Пры выездзе на аздараўленне і санаторна-курортнае лячэнне (санаторна-курортныя арганізацыі, дзіцячыя лагеры і іншыя аздараўленчыя арганізацыі) — прадастаўляецца даведка з санаторна-курортных і іншых аздараўленчых арганізацый;

✓ Пры лячэнні ў шпіталі — даведка з бальніцы аб перыядзе знаходжання ў ёй;

✓ Пры часовым утрыманні ў месцах папярэдняга зняволення і пазбаўлення волі прадастаўляецца даведка з месца папярэдняга зняволення або пазбаўлення волі;

✓ Пры праходжанні тэрміновай вайсковай службы (ваенных збораў) даецца даведка з вайсковай часці па месцы праходжання тэрміновай вайсковай службы, збораў;




✓ Пры выездзе ў сельскія населеныя пункты (у тым ліку на дачныя ўчасткі), на вучобу, у камандзіроўку — даведка з часовага месца жыхарства, з навучальнай установы, з месца працы.

Аднак часова адсутныя жыхары не вызваляюцца ад унясення платы за ацяпленне жылога памяшкання і карыстанне ліфтамі. Справа ў тым, што пераразліку платы падлягаюць тыя камунальныя паслугі, якія можна вымераць у натуральных велічынях (куб. м) і спажыванне якіх вар'іруецца кожны разліковы перыяд (кожны месяц). Гэта значыць спажыўцы гэтых камунальных паслуг аплачваюць фактычнае (у межах жылога дома, у якім жывуць) спажыванне гэтых паслуг. Што тычыцца карыстання ліфтамі, то гэтая паслуга не можа быць вымерана ў натуральных велічынях, адпаведна плата за карыстанне ёю налічваецца на кожнага, хто пражывае ў жылым памяшканні. Яна з'яўляецца платай не толькі за эксплуатацыю ліфта, але і за тэхнічнае абслугоўванне і вытворчасць рамонтных работ (планавых і пазапланавых). Акрамя гэтага, тыя, хто часова не пражывае, не вызваляюцца ад платы за тэхнічнае абслугоўванне.

**Святлана БУСЬКО.**

## Абзац

◢ У Беларусі павялічваецца колькасць дзяцей, народжаных жанчынамі, што знаходзяцца ў шлюбе. Зараз кожнае пятае дзіця нараджаецца па-за шлюбам, у той час як у 2005 г. такіх дзяцей было 24,2%.

◢ **Мінчане кампенсуюць крыху больш за 8% затрат на ацяпленне, паведаміў учора журналістам начальнік аддзела энергетыкі Мінгарвыканкама Анатоль Лаўнічук. Некалькі гадоў таму працэнт пакрыцця затрат быў 30%, затым знізіўся да 22%, што звязана з ростам кошту энергарэсурсаў, якія імпартуюцца.**

◢ Недарэчная выпадковасць: кіроўцу забіла частка падвескі аўтамабіля, якая валялася на дарозе. Трагічны выпадак адбыўся на дарозе побач з в. Солы Смаргонскага раёна. Частка рэсоры, якую мог згубіць любы аўтамабіль, вылецела з-пад колаў сустрэчнай машыны, прабіла лабавое шкло і ўваткнулася ў грудную клетку кіроўцы «Таёты». Мужчыне было 46 гадоў, ён жыў у Мінску, працаваў урачом. Пра гэты факт паведаміла газета «Вячэрні Гродна». Кіроўца аўтамабіля, які стаў ускоснай прычынай смерці, не ўстаноўлены. Ён, хутчэй за ўсё, не заўважыў, што наехаў на ракавую дэталь.

◢ **У Слуцку ў валютна-абменнай касе філіяла аднаго з банкаў супрацоўнікі аддзела дэпартамента аховы МУС затрымалі 39-гадовага мясцовага жыхара пры збыце дзвюх фальшывых грашовых купюр наміналам па 200 еўра. Высветлена, што фальшыўкі яму былі перададзены для рэалізацыі праз мясцовую жыхарку 35-гадовым жыхаром райцэнтра, які таксама затрыманы. Падчасператрусу ў пасярэдніка знайшлі яшчэ 26 аналагічных купюр. Распачатая справа.**

## Поўны абзац



◢ Масавая бойка студэнтак адбылася ў Актобе (былы Акцюбінск), на захадзе Казахстана. Па паведамленні інфармагенцтваў, навучэнкі двух мясцовых каледжаў не падзялілі хлопца. Як расказалі відавочцы, у бойцы ўдзельнічала каля 40 дзяўчат. Яны вучацца на другім курсе, гэта будучыя бухгалтары, фінансісты, спецыялісты нафтавай галіны. Каледжы дзейнічаюць пры двух мясцовых універсітэтах (імя Баішава і імя Жубанава). Хлопец, з-за якога біліся дзяўчаты, як сцвярджаюць, з'яўляецца пазашлюбным сынам вядомага ў краіне алігарха. Міліцыя падрабязнасці не паведамляе, але факт масавай бойкі пацвярджае.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

Утерянные страховые свидетельства: по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев ТС: ВС № 2950619, ВС № 3028963, ВС № 4947950, по добровольному страхованию наземных транспортных средств граждан: НС № 0011628, НС № 0011629 считать недействительными.

Сакратарыят Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю былога работніка аддзела па забеспячэнні работы Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі першага склікання па эканоміцы, бюджэце і фінансах **Маліноўскага Уладзіміра МІХАЙЛАВІЧА** і выказвае спачуванні яго родным і блізкім.

# «ШЧЫТ САЮЗА-2011» ПРАДЭМАНСТРАВАЎ ВЫСОКУЮ БАЯВУЮ ГАТОЎНАСЦЬ І МАРАЛЬНЫ ДУХ УЗБРОЕНЫХ СІЛ БЕЛАРУСІ

**Пра гэта на штогадовым семінары з кіраўнікамі рэспубліканскіх СМІ паведаміў міністр абароны Беларусі Юрый Жадобін, перадае БЕЛТА.**

«Вучэнні паспяхова завершаны, рэалізаваная іх задума, зацверджаная кіраўніком дзяржавы», — заявіў Юрый Жадобін. Міністр адзначыў і вышэйшую адзнаку падрыхтоўкі беларускіх вайскоўцаў з боку расійскага вышэйшага камандавання. Паводле слоў міністра, асноватворнай мэтай камандавання беларускімі часцямі было захаванне жыцця і здароўя кожнага вайскоўца. «Ніводзін салдат не атрымаў сур'ёзнай траўмы ці калецтва, ніхто не пацярпеў», — канстатаваў міністр абароны. Разам з тым, упершыню ў гісторыі УС Беларусі была ажыццёўлена такая маштабная перагрупоўка войскаў за тысячы кіламетраў. На расійскія палігоны «Ашулук» і «Гарахавецкі» былі перадыслакаваныя каля 5 тыс. чалавек, больш за 1,2 тыс. адзінак тэхнікі, 21 самалёт і верталёт.

## МЗС адзначае палітызацыю ўзаемаадносін з польскай нацыянальнай меншасцю Беларусі з боку Польшчы

**Аб гэтым гаворыцца ў адказе начальніка ўпраўлення інфармацыі — прэс-сакратара МЗС Андрэя Савіных на пытанне ад СМІ ў сувязі з запрашэннем пасла Беларусі ў МЗС Польшчы, паведамляе БЕЛТА.**

«Мы з задавальненнем успрымаем запэўненні польскага боку ў адсутнасці нейкіх замахаў на суверэнную тэрыторыю Беларусі», — адзначыў Андрэй Савіных. «Разам з тым мы не можам ігнараваць дзеянні польскіх улад, накіраваныя на палітызацыю ўзаемаадносін з польскай нацыянальнай меншасцю ў Беларусі, выдзяленне фінансавых рэсурсаў для ўмяшання ва ўнутрыпалітычныя працэсы ў нашай краіне, а таксама безадказныя выказванні вышэйшых службовых асоб Польшчы адносна Беларусі», — падкрэсліў прэс-сакратар. «Адмова польскага боку ад гэтых правакацыйных дзеянняў і дасць магчымасць ліквідаваць многія непатрэбныя праблемы ў нашых узаемаадносінах».

## «КРЭДЫТ, ЯКІ ПРАДАСТАВІЦЬ РАСІЯ, ДАПАМОЖА НАМ ПАСПЯХОВА РЭАЛІЗАВАЦЬ ПРАЕКТ БУДАЎНІЦТВА АТАМНАЙ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ»

Пра гэта заявіў **намеснік міністра энергетыкі Міхаіл МІХАДЗЮК** падчас 16-га Беларускага энергетычнага і экалагічнага кангрэса, які праходзіць у Мінску.

Па словах намесніка міністра, з увядзеннем атамнай электрастанцыі Беларусь зможа замясціць 5 млрд кубаметраў газу ў сваім паліўна-энергетычным балансе, зменшыць аб'ёмы выкідаў парніковых газаў на 7—10 млн тон за год, а самае галоўнае — знізіць у цэлым па краіне сабекошт вытворчасці электрычнай энергіі. 11 кастрычніка ў Санкт-Пецярбургу Беларусь і Расія падпісалі кантрактнае пагадненне па будаўніцтве атамнай электрастанцыі на нашай тэрыторыі.

— У кантрактным пагадненні вызначаны тэрміны будаўніцтва (першы блок — у 2017 годзе, другі — у 2018), асноўныя абавязкі бакоў па ўзвядзенні станцыі, кошт будаўніцтва, умовы плацяжоў і г.д.

Падпісанне кантрактнага пагаднення можна разглядаць як фактычны старт рэалізацыі праекта па будаўніцтве АЭС у Рэспубліцы Беларусь, дадаў намеснік міністра. Што тычыцца крэдытнага пагаднення, то яно знаходзіцца на высокай ступені гатоўнасці.

— Аб'ём прапанаваных крэдытаў дастатковы для таго, каб у адпаведнасці з падрыхтаваным крэдытным пагадненнем забяспечыць фінансаванне не менш за 90% кошту кантракта. У адпаведнасці з сусветнай практыкай, астатнія 10% заказчык звычайна пакрывае за кошт уласных сродкаў ці прыцягвае пазыковыя сродкі, — падсумаваў намеснік міністра энергетыкі.

З яго слоў, Беларусь па асобных этапах будаўніцтва станцыі ўжо прыступіла да праектных работ, а пэўныя будаўнічыя работы з выхадам на пляцоўку распачнуцца налета.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

Уладзімір КАРАГІН:

# «ТРЭБА ПРАВОДЗІЦЬ МЕРЫ ПА ЎМАЦАВАННІ БЕЛАРУСКАГА РУБЛЯ»

**У апошнія дні долар на дадатковай сесіі Беларускай валютна-фондавай біржы пайшоў угору, пераадолеўшы адзнаку нават у 9 тысяч рублёў. Пра тое, як рэагуе бізнэс на гэты рост, мы пацікавіліся ва Уладзіміра КАРАГІНА, старшыні ГА «Мінскі сталічны саюз прадпрымальнікаў і працадаўцаў».**

— Я вельмі станоўча ацэньваю той факт, што Нацыянальны банк зрабіў стаўку на рынкавыя метады: калі сітуацыя такая, што попыт перавышае прапанову і долар расце, то нічога страшнага не адбываецца, ідзе паэтапны выхад на адзіны курс. Які б ён ні быў — адзіны курс будзе вельмі станоўча ўплываць на эканоміку. Два курсы быць не павінна, гэта вельмі згубная з'ява, якая павінна быць часовай. Трэба ўсё выраўноўваць, гэта стабілізуе нашу эканоміку. А ў далейшым урад сумесна з бізнэсам чакае вельмі вялікая, шматгадовая праца па рэвальвацыі, як гэта ў свой час зрабілі Украіна, Польшча.

Сёння кошт долара і еўра будзе залежаць ад таго, якім попытам гэтыя валюты карыстаюцца. Разам з тым мы лічым, што трэба праводзіць меры па ўмацаванні беларускага рубля. Калі мы хочам мець сваю нацыянальную валюту, то менавіта ў ёй трэба весці ўсе разлікі і ўсе вымярэнні. Гэта прынцыповая пазіцыя. Бо калі мы пачынаем, напрыклад, камунальную аплату нейкага прадпрыемства разлічваць у валюце, то гэта падрывае давер да беларускага рубля.

***— А сёння прадстаўнікоў дзелавой супольнасці слухаюць ва ўрадзе?***

— Безумоўна, дыялог працягваецца. Пазіцыя дзелавой супольнасці і нашы прапановы разглядаюцца, прымаюцца да ўвагі. Ідзе, калі можна так сказаць, напаўненне дыялогу канструктыўным сэнсам і канструктыўнымі пазіцыямі. Але ўсё яшчэ толькі пачынаецца, бо дыялог трэба па-сапраўднаму выбудаваць. А то фармальна ў многіх міністэрствах створаны грамадска-кансультацыйныя саветы, але не ўдакладнены іх рэгламенты, спісы ўдзельнікаў, роля, пазіцыі, хто мае права вылучыць пытанні на парадак дня і г. д. У якасці станоўчага прыкладу магу прывесці вопыт працы з Мінгарвыканкамам: вось на наступным тыдні будзе пасяджэнне, і выканкам ужо даслаў нам пытанні, чакае кампетэнтных адказаў бізнэсу. Вось гэта дыялог, гэта рэальны ўлік пазіцый бізнэсу з магчымасцю канструктыўнай сумеснай працы, а не імітацыя гэтага дыялогу. Тут усё, як і ў жыцці, трэба выбудоўваць, яно само не прыйдзе. Але і прадпрымальнікам трэба быць больш актыўнымі, уваходзіць у бізнэс-асацыяцыі. Зараз, напрыклад, у віцебскую асацыяцыю ўваходзіць толькі 200 прадпрыемстваў, а павінна быць 2 тысячы. У рэгіёнах, у кожным раёне павінен быць дыялог бізнэсу і ўлады, і ён павінен быць наладжаны прафесійна. Бо сёння нават губернатары кажуць: «А з кім нам там весці дыялог?». Улада таксама не павінна быць расчараванай: з боку бізнэсу перамоўцамі павінны быць не дэкаратыўныя структуры, не пустышкі, а прафесіяналы, якія ўмеюць весці дыялог. І рабіць гэта не дзеля шкурных інтарэсаў 1-2 фірмачак, а дзеля ўсёй дзелавой супольнасці.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

**КПУП «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Автобусный парк № 6 г. Гомеля» (продавец) извещает о проведении 27 октября 2011 года повторного открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16**

| № лота | Наименование | Адрес объекта | Начальная цена продажи объекта, с учетом НДС, бел. руб. | Задаток, с учетом НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Административно-хозяйственный корпус инв. № 350/С-47647 площадью 255,4 кв.м | г. Гомель, ул. Шилова, 3а | 317 880 000 | 31 000 000 |

**Продавец:** Открытое акционерное общество «Автобусный парк № 6 г. Гомеля», ул. Федюнинского, 11а, 246015, г. Гомель.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

1. Оплатить задаток на расчетный счет Продавца (Открытое акционерное общество «Автобусный парк № 6 г. Гомеля») р/с 3012041640084 в филиале № 300 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501661, УНП 400092378 по **25 октября 2011 года включительно.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: ул. Гагарина, 20, каб. 2-16, г. Гомель в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения **по 25 октября 2011 года включительно.**

К участию в аукционе допускаются лица, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе по форме, определенной организатором аукциона, внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, представили другие необходимые документы и подписали соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

При подаче заявления в адрес организатора аукциона представляются: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 06.09.2011 г.

**Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74 17 34, 74 89 64 и на сайте gomeloblreklama.by.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВОГО И ПОВТОРНОГО АУКЦИОНОВ по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества**

**Организатор аукциона:** Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42 61 62.

**Продавец:** Республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта», тел. (0212) 36 37 25

| № лота | Предмет аукциона, срок договора аренды, наименование, местонахождение недвижимого имущества. Целевое использование. | Начальная цена (бел. руб.) | Размер задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|
| 1. | Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 12,74 кв.м, расположенного на 3 этаже капитального строения с инв. № 240/С-18515 по адресу: Витебская область, г. Орша, ул. Ленина, д. 46 для производственных целей (за исключением вредных производств), размещения офисов, складского помещения, оказания услуг, осуществления розничной торговли. | 111 475 | 11 140 |
| Дата, время и место проведения аукциона: 15.11.2011 в 15.00, г. Орша, ул. Ленина, 46, здание РУПС. Срок подачи документов: с 15.10.2011 с 8.30 по 14.11.2011 до 17.30. Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». | | | |

| № лота | Предмет аукциона | Начальная цена (бел. руб.) | Размер задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|
| 1. | Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 13,7 кв.м, расположенного на 2 этаже капитального строения с инвентарным номером 200/С-53951 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Ленина, д. 52/13 (отделение связи № 26) для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств). | 119 880 | 11 988 |
| 2. | Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещений площадью 26,9 кв.м, 8,7 кв.м, 11,1 кв.м, расположенных на 2 этаже капитального строения с инвентарным номером 200/С-53951 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Ленина, д. 52/13 (отделение связи № 26) для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств). | 408 630 | 40 863 |
| 3. | Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 25,2 кв.м, расположенного на 2 этаже капитального строения с инвентарным номером 200/С-53951 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Ленина, д. 52/13 (отделение связи № 26) для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, осуществления производства (кроме вредных производств) | 220 500 | 22 050 |
| 4. | Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 8,4 кв.м, расположенного на 3 этаже капитального строения с инвентарным номером 200/С-53951 по адресу: Витебская область, г. Витебск, ул. Ленина, д. 52/13 (отделение связи № 26) для осуществления торговли, оказания услуг, размещения складских помещений, офиса. | 73 500 | 7 350 |
| Дата, время и место проведения повторного аукциона: 27.10.2011 в 15.00, г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок подачи документов: с 15.10.2011 с 8.30 по 26.10.2011 до 17.30. Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Извещения о проведении аукционов опубликованы в газете «Звязда» № 56 от 26.03.2011, № 141 от 28.07.2011. | | | |

1. Для участия в аукционе приглашаются граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели.

2. Для участия в аукционе в адрес организатора аукциона необходимо представить:

- заявление на участие в аукционе, подписать соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;

- копию платежного документа о внесении задатка на р/с организатора аукциона, заверенную банком;

- юридическому лицу – резиденту Республики Беларусь: копию документа, подтверждающую государственную регистрацию юридического лица; копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

- юридическому лицу – нерезиденту Республики Беларусь: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

- индивидуальному предпринимателю: копию документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

- предъявить: представителем индивидуального предпринимателя, юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность.

3. Победителем аукциона будет признано лицо, предложившее наиболее высокую цену. Лицам, не выигравшим торги, задаток возвращается.

4. Продавец по результатам проведения аукциона заключает с победителем аукциона (лицом, приравненным к Победителю аукциона) договор аренды здания в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) приобретает право заключения договора аренды после оплаты стоимости предмета аукциона и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона. Цена продажи предмета аукциона не засчитывается в арендную плату, подлежащую уплате в соответствии с законодательством.

5. Победитель аукциона (лицо, приравненное к Победителю аукциона) обязан оплатить предмет аукциона, затраты на организацию и проведение аукциона в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона в порядке и размере, указанном в протоколе аукциона.

6. Сумма задатка перечисляется на р/с организатора аукциона: № 3012218220012 в Головном филиале по Витебской области ОАО «Белинвестбанк» г. Витебск, ул. Ленина, 22/16, МФО 701, УНП 390477566 (в бел. руб.); №3012000009469 (в дол. США) в ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Витебск, ул. Гоголя, 8, МФО 150801259, УНП 390477566. При перечислении денежных средств в иностранной валюте расходы по продаже валюты (перевод в белорусские рубли) возмещаются Победителем.

7. Контактный тел.: (0212) 42 61 62, e-mail: **vcm74@mail.ru, www.marketvit.by**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ**

**Организатор аукциона: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42 61 62**

**Продавец:** Открытое акционерное общество «ОРС Витебск», Республика Беларусь, г. Витебск, ул. Мясникова, 4а, тел. (0212) 37 92 98

| № лота | Наименование объекта, краткая характеристика | Начальная цена (бел. руб.), без учета НДС | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|
| 1. | Капитальное строение с инвентарным номером 220/С-61512, площадью 727 кв.м, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин № 1. Составные части и принадлежности: подвал, покрытие (асфальтобетонное двухслойное покрытие), покрытие (тротуарная бетонная плитка). Имущество расположено по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Титова, д. 20 на земельном участке с кадастровым № 240100000002000031, площадью 0,1063 га. | 387 953 407 | 38 795 340 |
| Аукцион состоится 17.11.2011 г. в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Окончательный срок подачи документов: 16.11.2011 г. до 17.30. | | | |

1. Для участия в аукционе приглашаются юридические и физические лица, индивидуальные предприниматели. Участнику необходимо подать заявление и подписать соглашение установленной формы.

2. Лицами, желающими принять участие в аукционе, к заявлению прилагаются: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с, указанный в извещении; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность. При подаче документов предъявляется паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

3. Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Победитель аукциона (претендент на покупку) подписывает протокол о результатах аукциона в день проведения аукциона.

4. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона.

5. Победитель аукциона (претендент на покупку) уплачивает НДС от цены продажи.

6. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан заключить договор купли-продажи не позднее 20 дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплатить предмет аукциона согласно сроков, указанных в договоре купли-продажи.

7. Реквизиты для перечисления задатка: р/счет № 3012218220012 в головном филиале по Витебской области ОАО «Белинвестбанк», МФО 150801701 (в бел. руб.); № 3012000009469 (в дол. США) в ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 150801259, УНП 390477566.

8. Организатор торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения торгов.

9. Дополнительную информацию можно получить по тел.: (0212) 42 61 62, (029) 514 36 47, e-mail: **vcm74@mail.ru, marketvit.by, www.gki.gov.by.**

**Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» проводит аукцион по продаже недвижимого имущества Лепельское коммунальное унитарное производственное предприятие жилищно-коммунального хозяйства «Лепель»**

| № лота | Наименование объекта, краткая характеристика | Начальная цена (бел. руб.) без учета НДС | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение с инвентарным номером 230/D-7828, расположенное по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, д. 19, пом. 1, площадью 293,7 кв.м, назначение – Помещение бытового обслуживания населения, наименование – Изолированное помещение № 1. | 140 902 830 | 14 090 280 |
| 2 | Изолированное помещение с инвентарным номером 230/D-7829, расположенное по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, д. 19, пом. 2, площадью 305,1 кв.м, назначение – Помещение бытового обслуживания населения, наименование – Изолированное помещение № 2. | 132 555 691 | 13 255 560 |
| 3 | Изолированное помещение с инвентарным номером 230/D-7830, расположенное по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Партизанская, д. 19, пом. 3, площадью 309,0 кв.м, назначение – Помещение бытового обслуживания населения, наименование – Изолированное помещение № 3. | 135 039 496 | 13 503 940 |
| Аукцион состоится 16.11.2011 г. Дополнительную информацию можно получить по тел.: (0212) 42 61 61, (029) 514 36 47, e-mail: **vcm74@mail.ru, marketvit.by, www.gki.gov.by.** | | | |

## Крымінал, здарэнні

### АБАРВАЛАСЯ СТРАЛА МАНІПУЛЯТАРА

**На аўтамагістралі Гомель—Кобрын кіроўца ПУП «Пінская аўтамабільная школа» рамантаваў аўтобус «Неаплан 216».**

Падчас рамонту абарвалася страла маніпулятара а/м «Камаз», які належаў індывідуальнаму прадпрымальніку, у выніку чаго кіроўца аўтобуса, жыхар Пінска, загінуў.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### ТРЫ ТРУПЫ Ў «ЖЫГУЛЯХ»

**На 34-м кіламетры аўтадарогі Віцебск—Лёзна—мяжа Расійскай Федэрацыі адбылася жудасная аварыя. Паводле звестак ДАІ, а сёмай гадзіне вечара 54-гадовы вадзіцель у дождж не справіўся з кіраваннем аўтамашынай «ВАЗ-2107» і выехаў на паласу сустрэчнага руху, дзе сутыкнуўся з аўтамашынай «ДАФ» пад кіраваннем 56-гадовага грамадзяніна Польшчы.**

У выніку дарожна-транспартнага здарэння вадзіцель аўто «Жыгулі» і два пасажыры, 1955-га і 1960-га гадоў нараджэння, памерлі на месцы здарэння. Усе трое — жыхары вёскі Крынкі Лёзненскага раёна.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ, Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ПАДПОЛЬНЫ «МЕТАЛІСТ»-МІЛЬЯНЕР

**Аршанскім міжраённым аддзелам Упраўлення дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю па Віцебскай вобласці заведзена крымінальная справа ў адносінах да індывідуальнага прадпрымальніка з Оршы, які, не маючы спецыяльнай ліцэнзіі, ажыццяўляў нарыхтоўку лому і адходаў чорных і каляровых металаў.**

Машыны гэтага прадпрымальніка былі затрыманы супрацоўнікамі праваахоўных органаў. Лом чорнага і каляровага чорнага металу агульным коштам больш як 54,4 мільёна рублёў канфіскавалі ў даход дзяржавы.

### АДКУЛЬ МУКА?

У вёсцы Завольша Лёзненскага раёна супрацоўнікамі аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі Віцебскага аддзела ўнутраных спраў па транспарце і абласной мытні была затрымана аўтамашына «Івека» пад кіраваннем жыхара вёскі Дворышча Расонскага раёна. Ён перавозіў 20 тон пшанічнай мукі без адпаведных дакументаў. Груз канфіскавалі.

### ЗАБІЎ І ПАЕХАЎ

**У Полацку а палове першай гадзіны ночы вадзіцель 1984 года нараджэння, кіруючы аўтамашынай «Тата», здзейсніў наезд на пешахода 1958 года нараджэння, які загінуў.**

Вадзіцель з месца здарэння знік, але быў затрыманы падчас уведзенага ДАІ плана «Перахоп». Абодва: і вадзіцель, і яго ахвяра — непрацуючыя мясцовыя жыхары.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### ЗАЙШОЎ ДА СУСЕДКІ...

**У Пінскім раёне ад рук забойцы загінула жанчына. Пад падазрэнне трапіў 19-гадовы сусед няшчаснай.**

Вечарам ён зайшоў да яе на добрым падпітку, нібыта хацеў перасядзець час, каб не вяртацца дадому ў п'яным выглядзе. А 52-гадовая кабета папрасіла незванага госця выбірацца... Яе знайшлі калегі, якія прыйшлі ў дом, бо жанчына другі дзень не выйшла на працу, а на званкі не адказвала. Экспертыза ўстанавіла, што смерць наступіла ад пабояў: зламыснік нанёс ёй тры ўдары каменем па галаве. Вядзецца следства.

**Яна СВЕТАВА.**


**ВНИМАНИЮ АКЦИОНЕРОВ ОАО «ОмегаБизнесКласс»**

Открытое акционерное общество «ОмегаБизнесКласс», сообщает о покупке акций собственного выпуска на внебиржевом рынке на следующих условиях:

| | |
|---|---|
| **Полное наименование и место нахождения покупателя акций, контактный телефон** | Открытое акционерное общество «ОмегаБизнесКласс», 220053 г. Минск, ул. Орловская, 58, оф. 216, тел. 8 (017) 210 19 34 |
| **Полное наименование и место нахождения эмитента, акции которого приобретаются** | Открытое акционерное общество «ОмегаБизнесКласс», 220053, г. Минск, ул. Орловская, 58, оф. 216 |
| **Цель приобретения акций** | Последующая продажа инвестору на условиях, предусмотренных бизнес-планом |
| **Цена, по которой покупатель намерен приобретать акции** | Цена покупки – 100 (сто) долларов США за одну штуку. |
| **Количество акций, которые покупатель намерен приобрести** | 800 (Восемьсот) штук |
| **Срок, форма и порядок оплаты акций** | Денежными средствами в белорусских рублях по курсу НБ РБ на дату оплаты безналичным перечислением на счет продавца в течение 60 календарных дней с даты зачисления акций на счет ОАО «ОмегаБизнесКласс». При оплате нерезиденту – денежными средствами в долларах США безналичным перечислением на счет продавца в течение 60 календарных дней с даты зачисления акций на счет ОАО «ОмегаБизнесКласс». |
| **Адрес, по которому будут заключаться договоры купли-продажи акций** | 220053, г. Минск, ул. Орловская, 58, оф. 216 |
| **Дата начала и окончания срока представления предложений акционеров о продаже акций** | С 14 октября 2011 г. по 13 ноября 2011 г. |
| **Дата начала и окончания покупки акций (заключения договоров купли-продажи).** | С 14 ноября 2011 г. по 14 декабря 2011 г. |


# Аляксандр КАВАЛЕНЯ: «Гуманітарныя веды абавязаны несці ў грамадскае асяроддзе сацыяльны аптымізм»



***Сёння ў беларускіх навукоўцаў-гуманітарыяў свята: якраз 75 гадоў таму ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі было створана аддзяленне грамадскіх навук. Пра тое, з чым падышлі беларускія навукоўцы да гэтага юбілею, нам расказаў акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі Аляксандр КАВАЛЕНЯ.***

— За 75-гадовы перыяд дзейнасці Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі гуманітарная навука развівалася разам з беларускім грамадствам, дапамагаючы пераадольваць сацыяльна-эканамічныя складанасці і ваенныя наступствы. Знаходзячыся нават у выключна складаных умовах рэпрэсіўнай палітыкі 30-х гадоў XX стагоддзя, яе лепшыя прадстаўнікі аддана служылі беларускаму народу, абапіраючыся на моцны духоўны падмурак папярэднікаў. Ля вытокаў збірання, назапашвання і распаўсюджвання ведаў пра беларускі народ, яго культуру і звычаі стаялі выдатныя асветнікі Кірыла Тураўскі і Ефрасіння Полацкая, Мікола Гусоўскі і Францыск Скарына, Сымон Будны і Васіль Цяпінскі, Сімяон Полацкі і многія іншыя.

Гуманітарныя даследаванні развіваліся ў цеснай сувязі з гісторыяй, этнаграфіяй, фальклерыстыкай, археалогіяй і філалогіяй. Фундаментальныя працы гуманітарыяў Ігната Даніловіча, Мітрафана Доўнар-Запольскага, Зарыяна Даленгі-Хадакоўскага, Тамаша Зана, Яўхіма Карскага, Міхаіла Каяловіча, Дзмітрыя Лапо, Тэадора Нарбута, Мікалая Нікіфароўскага, Івана Насовіча, Еўдакіма Раманава, Аляксея Сапунова, Канстанціна Тышкевіча, Яна Чачота, Паўла Шэйна, Мікалая Янчука адкрылі перад навуковым светам новыя, практычна не даследаваныя старонкі гісторыі матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў, заклалі трывалы падмурак гуманітарных ведаў, якія садзейнічалі фарміраванню беларускай нацыі і дзяржаўнасці.

Далейшае развіццё нацыянальнай гісторыі і культуры актыўна працягвалася пасля заснавання ў 1929 годзе Беларускай акадэміі навук. Гэта быў важны і знакавы этап умацавання айчыннай сацыяльна-гуманітарнай навукі, што садзейнічаў значнаму пашырэнню ведаў у беларускім грамадстве. Разумеючы сацыяльную і грамадскую іх важнасць, Прэзідыум Акадэміі навук БССР у маі 1936 года прыняў рашэнне аб стварэнні Аддзялення грамадскіх навук, у склад якога былі ўключаны інстытуты філасофіі і права, эканомікі, гісторыі, літаратуры і мовы, Педкабінет і Фальклорная камісія.

Шмат увагі арганізацыі гуманітарнай навукі ўдзялялі акадэмікі-сакратары Аддзялення Сямён Вольфсан, Уладзімір Перцаў, Цімафей Гарбуноў, Пятро Глебка, Казімір Буслаў, Мікалай Бірыла, Генадзь Лыч, Аляксандр Падлужны, Пётр Нікіценка. Дзякуючы іх творчай і арганізацыйнай працы Аддзяленне пераўтварылася ў каардынуючы комплекс даследаванняў у вобласці сацыяльных і гуманітарных навук нашай краіны.

Змены ў грамадска-палітычным жыцці выклікалі неабходнасць перамен у грамадска-гуманітарнай навуцы. У 1992 годзе Аддзяленне грамадскіх навук Акадэміі навук БССР было ператворана ў Аддзяленне гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі.

**«...Дасягненні ў галіне развіцця прыродазнаўчых навук і тэхнікі значна апераджаюць духоўны стан людзей...»**

Як бачым, нават невялікі позірк у мінулае навуковай думкі сведчыць пра тое, што беларуская гуманітарная навука Беларусі мае глыбокія гістарычныя карані. Развіццё навукі вызначалася не толькі логікай руху навуковых ідэй, але галоўным чынам, самім жыццём, пануючымі рэлігійнымі, філасофскімі, ідэалагічнымі плынямі і палітычнымі стасункамі. Фарміраванне навукі было цесна звязана з карэннымі праблемамі нацыянальнага і сацыяльнага развіцця грамадства.

Сёння ў склад Аддзялення ўваходзяць шэсць дзяржаўных навуковых устаноў: **Інстытут філасофіі, Інстытут эканомікі, Інстытут сацыялогіі, Інстытут гісторыі, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы, Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы.** У канцы 2010 года пастановай Прэзідыума НАН Беларусі ў склад Аддзялення былі ўключаны Цэнтральная навуковая бібліятэка ім. Якуба Коласа НАН Беларусі і Выдавецкі дом «Беларуская навука». У навуковых установах плённа працуюць 533 даследчыкі, у тым ліку 8 акадэмікаў і 16 членаў-карэспандэнтаў, а таксама 64 доктары і 206 кандыдатаў навук, якія прымаюць актыўны ўдзел у дзейнасці Аддзялення.

Многія прадстаўнікі нашага Аддзялення — гонар не толькі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Даследаванні і творчыя мастацкія працы найбольш яркіх прадстаўнікоў гуманітарных ведаў — Усевалада Ігнатоўскага, Вацлава Ластоўскага, Іосіфа Лёсіка, Паўла Горына, Зміцера Жылуновіча, Сцяпана Некрашэвіча, Сямёна Вульфсана, Якуба Коласа, Кандрата Крапівы, Цімафея Гарбунова, Казіміра Буслава, Міхася Лынькова, Мікалая Нікольскага, Уладзіміра Перцава, Петруся Броўкі, Заіра Азгура, Пятра Глебкі, Максіма Танка, Івана Краўчанкі, Васіля Барысенкі, Віктара Каваленкі, Аляксандра Адамовіча, Мікалая Бірылы, Міхаіла Лазарука, Іларыёна Ігнаценкі, Івана Шамякіна, Аляксандра Падлужнага, Альфрэда Майхровіча, Івана Навуменкі, Міхаіла Савіцкага — не толькі шырока вядомы ў нашай краіне, але і за мяжой. Іх фундаментальныя працы аказалі велізарны ўплыў на грамадска-палітычнае жыццё, фарміравалі нацыянальнае і духоўна-культурнае аблічча Беларусі XX стагоддзя. Лепшыя творчыя дасягненні многіх прадстаўнікоў гуманітарнай навукі складаюць скарбніцу айчыннай і сусветнай культуры, з'яўляюцца яркім і пераканаўчым сведчаннем бязмежнага таленту беларускага народа, яго невычэрпнай духоўнай сілы.

***— Але ў апошні час можна пачуць даволі вострыя ацэнкі стану гуманітарных навук...***

— Сапраўды, некаторыя кажуць пра тое, што «гуманітарная навука на раздарожжы», што «набліжаецца спад гуманітарнай навукі», «гуманітарная навука ў палоне пошукаў» і г.д. Вядома, што пасля таго, як у канцы XX — пачатку XXI стст. марксісцкая метадалогія перастала быць афіцыйнай і дамінуючай, беларускі гуманітарны комплекс таксама перажыў складаны этап свайго развіцця. Ён характарызаваўся сінергетычным узаемадзеяннем навуковых праблем з істотнымі зменамі ў грамадска-палітычным, эканамічным і культурным жыцці, якія былі выкліканы станаўленнем суверэннай Рэспублікі Беларусь.

Адыход ад сацыялізму і пераход грамадства да сістэмы каштоўнасцяў і адносін, уласцівых буржуазнаму ладу жыцця, быў даволі балючым. Кожны чалавек, кожны інстытут улады, кожная навуковая ўстанова адчувалі вядомы сацыяльны, маральны і псіхалагічны надлом. Гуманітарная навука не была выключэннем, яе таксама не абмінуў светапоглядны і метадалагічны крызіс. Можна па-рознаму трактаваць і ацэньваць яе стан, але наўрад ці можна сумнявацца ў тым, што гуманітарная навука сапраўды існуе і аказвае значны ўплыў на стан і развіццё сацыяльна-эканамічных і грамадскіх працэсаў.

Тым не менш, сённяшняе становішча грамадскага жыцця можна ахарактарызаваць як сусветны духоўны крызіс. Еўрапейская прастора, у тым ліку і Беларусь, апынулася пад моцным уздзеяннем амерыканізму, яго тэхнагенна-спажывецкай ідэалогіі. З іншага боку, нельга не заўважаць, што дасягненні ў галіне развіцця прыродазнаўчых навук і тэхнікі значна апераджаюць духоўны стан людзей. Відавочна, што навукова-тэхнічны прагрэс, які сёння не ўраўнаважаны духоўнымі каштоўнасцямі людзей, можа прывесці да сусветнай тэхнагеннай катастрофы. Цывілізацыя з тэхнагенна-спажывецкай ідэалогіяй без усялякай меры эканамізавала адносіны паміж людзьмі, што, безумоўна, прыводзіць да падзення духоўна-каштоўнаснай сутнасці чалавека. Грамадскае развіццё штучна падштурхоўваецца да «эпідэміі эканамізму», я нават сказаў бы, да прыняцця нейкага своеасаблівага «культу прагрэсу». Сёння многае, ды амаль усё, уключаючы цела, дух і душу, разглядаецца праз прызму камерцыйнага поспеху. Між тым, варта нагадаць, што эканоміка — гэта толькі частка грамадскага жыцця. Развіццё сусветнага грамадства без яскрава акрэсленых духоўных арыенціраў, накіраваных на гарманічнае развіццё чалавека, — гэта бесперспектыўны і тупіковы напрамак будучыні сусветнай супольнасці.

***— Значыць, калі я правільна вас разумею, трэба разбавіць «фізіку» «лірыкай»?***

— Я лічу, што менавіта гуманітарныя веды абавязаны несці ў грамадскае асяроддзе сацыяльны аптымізм, павагу да гістарычнага мінулага, талерантнае стаўленне да іншадумства і, у рэшце рэшт, забяспечваць нівеліраванне магчымых сацыяльных канфліктаў. На пярэдні план дзейнасці выходзіць праблема прагназавання і выяўлення найбольш балючых і значных сацыяльных напружанняў у грамадстве. Асабліва актуалізуецца неабходнасць выпрацоўкі адэкватных і навукова абгрунтаваных рэкамендацый дзеля мінімізацыі негатыўных тэндэнцый у развіцці беларускага грамадскага. Безумоўна, з парадку дня нельга здымаць апрабаваны і пацверджаны жыццём напрамак дзейнасці, накіраваны на шырокую прапаганду пазітыўных з'яў і дасягненняў беларускіх людзей. Сёння гэта адна з найбольш важных задач вучоных і ідэолагаў, бо паказ і яркая дэманстрацыя шматлікіх станоўчых прыкладаў дазволяць мінімізаваць негатыўныя фатальна-песімістычныя настроі людзей, будзе садзейнічаць узмацненню бачнасці і рэальнасці перспектыў сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускага грамадства.

**«...Паказ і яркая дэманстрацыя шматлікіх станоўчых прыкладаў дазволяць мінімізаваць негатыўныя фатальна-песімістычныя настроі людзей...»**

У наш няпросты час гуманітарная навука абавязана дапамагчы беларускаму народу эфектыўна і з найменшымі стратамі пераадолець негатыўныя наступствы глабальнага сусветнага крызісу, каб найбольш паспяхова і эфектыўна рэалізаваць унікальны інтэлектуальны патэнцыял беларускага народа. У гэтай сувязі неабходна звярнуць увагу на той факт, што важнай умовай для паспяховага пераходу нашай краіны да інавацыйнага развіцця з'яўляецца не толькі наяўнасць найноўшай тэхнікі, тэхналогій, але і развіццё чалавечага рэсурсу. Архіважным становіцца разуменне кожным таго, што творча працаваць, здзяйсняць навуковыя адкрыцці на ўзроўні лепшых сусветных узораў трэба дзеля росту дабрабыту беларускага народа, для росквіту Рэспублікі Беларусь. А гэта, у сваю чаргу, з'яўляецца ўкладам беларусаў у скарбонку развіцця сусветнай цывілізацыі. Кожны грамадзянін нашай краіны павінен быць не толькі высокакваліфікаваным спецыялістам, але і патрыётам сваёй Айчыны. Калі чалавек нічога не бачыць станоўчага ў мінулым, калі ён толькі здольны асуджаць мінулае і сучаснае, ён становіцца маргінальнай асобай, разбуральнікам уласнай дзяржавы.

**«...Калі чалавек нічога не бачыць станоўчага ў мінулым, калі ён толькі здольны асуджаць мінулае і сучаснае, ён становіцца маргінальнай асобай, разбуральнікам уласнай дзяржавы...»**

Неабходна падкрэсліць, што гуманітарная навука ў яе сапраўднай ідэйна-светапогляднай разнастайнасці, якая не абцяжарана дагматамі, — гэта не толькі крыніца, але генератар, я б нават сказаў, лакаматыў развіцця духоўнай культуры народа, больш за тое, — гэта надзейны фарпост ад самаразбурэння грамадства. Важна пазначыць, што толькі на шляху разнастайнага багацця канцэпцый і падыходаў, свабодных дыскусій і абмену навуковымі ідэямі магчыма паспяховае развіццё айчыннай гуманітарнай навукі. Гэта не намі прыдумана, што набліжэнне да ісціны можа нарадзіцца толькі ў спрэчках, а не ў адзінай уніфікаванай аднадумнасці.

І я хачу адзначыць, што вынікі нашых навуковых даследаванняў яскрава сведчаць пра тое, што нам ёсць што прапанаваць грамадству ў якасці найноўшага інфармацыйнага прадукту, які адпавядае нацыянальна-дзяржаўным інтарэсам. За мінулую пяцігодку, нягледзячы на шэраг складанасцяў, было апублікавана амаль 8 тысяч артыкулаў і тэзісаў, падрыхтавана і выдадзена звыш 430 кніжных выданняў, у тым ліку 327 манаграфій. Як бачым, гэта досыць значныя паказчыкі. Дастаткова звярнуць увагу на такія выданні, як «Беларусь: Народ. Дзяржава. Час», арыгінальнае выданне 1-га тома «Вялікага гістарычнага атласа Беларусі», шматтомнае энцыклапедычнае выданне «Гарады і вёскі Беларусі», «Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце», фундаментальную працу «Беларусы», шасцітомнік «Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі», першы том трохтомніка «Гісторыі эстэтычнай думкі Беларусі», «Беларускі арфаграфічны слоўнік», «Беларуска-рускі слоўнік», «Руска-беларускі слоўнік», «Асобна, разам, праз злучок», «Вялікая, малая літара», «Слоўнік беларускай мовы», тры тамы «Помнікаў даўняга пісьменства Беларусі» і іншыя.

Безумоўна, даследаванні беларускіх навукоўцаў будуць садзейнічаць развіццю нашай маладой незалежнай дзяржавы, забеспячэнню якасці адукацыі і кадравага навуковага патэнцыялу, захаванню гісторыка-культурнай спадчыны, умацаванню нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь. Магчымасць вырашэння многіх задач, якія паўстаюць перад сацыяльна-гуманітарнай навукай, яе здольнасць своечасова адказваць на выклікі часу грунтуецца на падтрымцы, якую аказвае кіраўніцтва дзяржавы. На Першым з'ездзе вучоных Беларусі Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка справядліва падкрэсліў, што гуманітарныя навукі «асабліва актуальныя для нашай маладой дзяржавы, у якой шмат чаго яшчэ фарміруецца, знаходзіцца ў стадыі станаўлення». Гэта патрабуе ад гуманітарных ведаў крытычнага перагляду старых і выпрацоўкі новых фундаментальных метадалагічных прынцыпаў, на падставе якіх ажыццяўляецца дзейнасць і прымаюцца рашэнні на розных узроўнях грамадскай арганізацыі. Адказваючы на выклікі часу, сацыяльна-гуманітарныя навукі павінны распачаць сістэмную працу па вырашэнні праблем метадалогіі дзяржаўнага будаўніцтва, сацыяльнага кіравання, адукацыі і выхавання, камунікацыі, міжкультурнага ўзаемадзеяння і інтэграцыі. Тут я вылучыў бы наступныя важнейшыя напрамкі: па-першае, гэта стварэнне комплексу сучасных сродкаў гуманітарнага пазнання, якія б дазвалялі раскрываць прыроду такой складанаарганізаванай, шматузроўневай і дынамічнай сацыяльнай рэальнасці, як сучаснае беларускае грамадства. Па-другое, гэта даследаванне асаблівасцяў функцыянавання нацыянальнай дзяржавы ў архітэктуры глабальнай бяспекі, міжэтнічнага, міжкультурнага, міжканфесійнага дыялогу. Па-трэцяе, даследаванне характэрных рыс беларускай нацыянальнай культуры не толькі як сістэмы матэрыяльных і духоўных каштоўнасцяў, але і як дзейнасці, якая накіраваная на захаванне, узнаўленне і трансляцыю прынцыпаў і нормаў мыслення, асноў светапогляду і «жывой» ідэалогіі, што складаюць базіс сацыяльна адказнай асобы — грамадзяніна нашай краіны. Па-чацвёртае, выключна важная задача — актуалізацыя айчыннай інтэлектуальна-культурнай спадчыны, узнаўленне забытых старонак гісторыі і культуры. Тое, што многія персаналіі, ідэі, канцэпцыі, помнікі нашай гісторыі ўводзяцца ў сусветны навуковы і культурны зварот, істотным чынам «працуе» на міжнародны імідж беларускай навукі і дзяржавы ў цэлым. Па-пятае, кансалідацыя беларускай гуманітарнай супольнасці ў пошуку шляхоў пераадолення крызісу духоўнасці і павышэння чалавечага патэнцыялу, гарманізацыі сацыяльна-прыродных адносін.

І нарэшце, апошняе — хоць, наадварот, можна было б назваць гэты напрамак найважнейшым — фарміраванне інавацыйнай культуры. Было б памылкай разумець інавацыйны працэс як простае механічнае абнаўленне тэхналогій вытворчасці і выпрацоўкі схем упраўлення. Інавацыйнае развіццё беларускага грамадства — гэта пасвойму ўнікальная, шматаспектная задача, якая ўключае ў сябе і захаванне традыцыйных сацыяльных формаў і сувязяў, і ўкараненне новых тэхналагічных і арганізацыйных механізмаў, і пераарыентацыю сістэмы вытворчасці ведаў на актуальныя праблемы нацыянальнага будаўніцтва, і неабходную экалагічную і этычную экспертызу прагрэсу тэхналогій. Гістарычны вопыт вучыць: поспех навуковых і сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў у любой дзяржаве залежыць ад светапогляду сучаснікаў, іх культуры, маральна-этычных якасцяў і паводзін людзей, іх актыўнага і добрасумленнага ўдзелу ў вытворчым працэсе.

**Падрыхтаваў Павел БЕРАСНЕЎ.**


**ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ**

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 15 ноября 2011 года проводит 18-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности**

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Год выпуска | Пробег в км | Начальная цена продажи (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
